*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. F. Samusik*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)“15-17”**

# АДЛЮСТРАВАННЕ ГІСТОРЫІ АЙЧЫННАЙ АДУКАЦЫІ Ў МЕМУАРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ XVI–XVIII СТАГОДДЗЯЎ

# ILLUSTRATION OF THE HISTORY OF NATIONAL EDUCATION IN THE MEMOIR LITERATURE OF THE XVI$^{TH}$–XVIII$^{TH}$ CENTURIES

*Навуковы артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі тэме апісання ў мемуарах XVI–XVIII ст. працэсу навучання іх складальнікаў у айчынных ды замежных адукацыйных асяродках. Прыведзены адпаведныя ўспаміны М. Гусоўскага, Ф. Еўлашоўскага, І. В. Руцкага, М. Форбек-Летава, І. Яўлевіча, І. Турчыноўскага, Б. і М. К. Радзівілаў, І. Завішы, М. Матушэвіча, І. Быкоўскага, Ю. У. Нямцэвіча. Іх аналіз дазваляе ўдакладніць гісторыю асобных навучальных установаў, вызначыць спецыфіку развіцця тутэйшай школьнай справы ў час Контррэфармацыі ды ў перыяд пашырэння ў краіне ідэй эпохі Асветніцтва, а таксама раскрыць сутнасць «гранд тураў» шляхетнай моладзі з Беларусі.*

*Ключавыя словы: адукацыя; мемуары; «навука руская»; езуіты; пратэстанты; праваслаўная брацкая школа ў Магілёве; замежныя адукацыйныя паездкі; езуіцкі калегіўм у Брэсце; піярскі калегіўм у Віцебску; грамадзянска-патрыятычнае выхаванне.*

*The scientific article is devoted to the undeveloped topic in historiography of the description in memoirs of the 16th – 18th centuries of the process of their compilers’ education in domestic and foreign educational environments. The relevant memoirs of M. Gusovsky, F. Evlashovsky, I. V. Rutsky, M. Forbek-Letov, I. Yaulevich, I. Turchynovsky, B. and M. K. Radziwill, I. Zavisha, M. Matuszewicz, I. Bykovsky, Y. U. Nemtsevich are given. Their analysis allows us to clarify the history of individual educational institutions, determine the specifics of the development of local school affairs during the Counter-Reformation and during the period of the expansion of the ideas of the Enlightenment era in the country, as well as to reveal the essence of the “grand tours” of noble youth from Belarus.*

*Keywords: education; memoirs; “Russian science”; Jesuits; Protestants; Orthodox fraternal school in Mogilev; foreign educational trips; Jesuits collegium in Brest; Piarists collegium in Vitebsk; civic and patriotic accomplishment.*

Адукацыя на тэрыторыі Беларусі пачала хутка развівацца ў XVI ст. Пад уплывам эпохі Адраджэння ў грамадстве пашыралася ідэя аб тым, што толькі яна здольна дапамагчы чалавеку раскрыць уласныя прыроджаныя здольнасці. Умацаванне гуманістычнага светапогляду спрыяла секулярызацыі паўсядзённага жыцця ды адкрыла шлях да развіцця свецкай культуры. Адчувала гэта і тагачасная айчынная літаратура. Панаваўшы ў школах граматыка-рытарычны тып навучання прадугледжваў шматлікія самастойныя пісьмовыя практыкаванні. У выніку, вучні прывучаліся выкладаць уласныя думкі на паперы, а шмат хто працягваў гэта рабіць і ў сталым

узросце. Папулярнасць набылі: эпісталярны жанр, складанне гаспадарчых, паліталагічных, панегірычных і гераічна-эпічных твораў, пераклад трактатаў антычных мысліцеляў. Павышаная цікавасць у грамадстве да злобадзённых праблем і актыўная грамадзянская пазіцыя асобных прадстаўнікоў шляхты ды мяшчан садзейнічала з'яўленню мемуарыстыкі.

Зразумела, што практычна ўсе, хто браўся за пяро з мэтай апісання ўласнага жыцця, пачыналі са свайго дзяцінства, а значыць не маглі абыйсці пытанні, звязаныя з вучобай. На жаль, якраз гэты аспект успамінаў ніколі прадметна не аналізаваўся ў гістарыяграфіі. Разам з тым, азначаны мікраўзровень асабістага сталення часам дазваляе лепш зразумець стан адукацыйнай справы у той ці іншы час, як на тэрыторыі ўсёй краіны, так і ў канкрэтным горадзе. Менавіта гэтым тлумачыцца актальнасць і навуковая навізна дадзенага даследавання.

Першым тут можна прывесці ўрывак з «Песні пра зубра» М. Гусоўскага, які наконт свайго навучання ў дзіцячыя гады адзначаў наступнае:

Свет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх,
Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай… [1, с. 58].

Сама паэма была складзена на лацінскай мове, і яе аўтар выдатна валодаў красамоўнымі прыёмамі. Гэта праява таго, што М. Гусоўскі атрымаў адукацыю ў каталіцкай школе, але азначаны фрагмент сведчыць і аб другім баку яго вучобы – па творах, напісаных на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Такі варыянт засваення пачатковых ведаў, акрамя іншага, тлумачыцца нешматлікасцю навучальных устаноў у тагачаснай Беларусі. Пацвярджае гэта і дзённік Ф. Еўлашоўскага, які нарадзіўся ў праваслаўнай шляхецкай сям'і ў Ляхавічах у 1546 г. Наконт сваёй пачатковай адукацыі ён пісаў: «А в пятом року почато ме бавить наукою русской, кгды ж в тых часех в тэй нашей строне не было еще инших наук…». Лівонская вайна адарвала яго ад кніг. Толькі ў 20-гадовым узросце ў час свайго знаходжання ў Вільні ён вырашыў працягнуць вучобу. На той момант Ф. Еўлашоўскі ўжо стаў кальвіністам і лагічна было чакаць, што ён будзе вучыцца ў адзінаверцаў у сталічнай гімназіі. Але, адпаведна ўспамінаў, ён абмежаваўся наведваннем збора і прыватнымі ўрокамі. Першы напрамак апісаны так: «Мел великую утеху, слухаючи слова божого вэ зборе хрестиянским за министров учоных Вендрокгорского и Костеницкого». А другі мемуарыст здолеў ажыццявіць праз знаёмства з кн. Я. Макавецкім, які нягледзячы на сваё каталіцкае веравызнанне дапамог маладому пратэстанту ў засваенні асноў матэматыкі і рахункаводства: «Ме барзей в тэ то личбы вправил…» [2, с. 32–33, 69]. Такім чынам, дзённік Ф. Еўлашоўскага ўскосна сведчыць аб заняпадзе Віленскай кальвінскай гімназіі пасля смерці кн. М. Радзівіла Чорнага ў 1565 г.

Аднаўленне яе адбылося па ініцыятыве кн. М. Радзівіла Рудога ў 1577 г., але мясцовыя езуіты рабілі ўсё магчымае каб пераманіць адсюль вучнёўскую моладзь. У тым ліку і для гэтага яны арганізоўвалі ў горадзе публіч-

ныя дыспуты са сваімі супернікамі. Наколькі моцнае ўздзеянне апошнія аказвалі на «розум і сэрца» прысутных сведчыць прыклад І. В. Руцкага, якога па асабістаму прызнанню надзвычай моцна ўразіла красамоўства езуітаў (згадвае іх палеміку з праваслаўным багасловам Васіліям з Астрога), у выніку чаго ён вырашыў пасля заканчэння Віленскай кальвінскай школы ў 1590 г. адправіцца за мяжу, дзе змяніць веравызнанне і ўступіць у ордэн (у далейшым ён усё ж адмовіўся ад сваей задумы і стаў уніятам, дасягнуўшы пасады кіеўскага мітрапаліта) [3, с. 11].

Таксама езуіты запрашалі пратэстантаў да сабе на вучобу. Лютэранін М. Форбек-Летавы ва ўласных мемуарах пісаў, што з прапановай паступіць у Віленскі калегіўм звярнуўся да яго езуіт Грушэўскі, які, праэкзаменаваўшы юнака, сказаў: «Абяцаю святарскім словам, што за паўгода навучу цябе больш, чым у школах, да якіх ты хадзіў усе гэтыя гады *(Віленская лютэранская школа, прыватны рэпетытар нямецкай мовы ў Кенігсбергу, курс медыцыны ў гімназіі Гданьска.* – А. С.). Што ж да рэлігіі, гарантую, спакой ад мяне будзешь мець». Аб сваім навучанні ў езуітаў (завяршыў яго ў 1610 г.) М. Форбек-Летавы пісаў наступнае: «Вымушаны прызнаць, што старанна і добразычліва яны вучаць, моладзь даглядаюць, нават калі тая не жадае, частымі рэпетыцыямі развіваюць здольнасці, каб чамусьці навучыць. Па методыцы вучаць, не абцяжарваюць рознымі лекцыямі моладзь, як у іншых школах прынята… Што ж рэлігіі датычыцца, праўда, ад гэтага прафесара не меў я ціску, але ад ксяндза Якуба Ортыўса Іспанца занадта…» [4, с. 32–33].

У сваю чаргу, становішча з праваслаўнай адукацыяй на ўсходзе Беларусі ў гэты час выдатна апісаў ва ўласнай аўтабіяграфіі І. Яўлевіч. Нягледзячы на тое, што сам ён быў родам з Магілёва распачаць сваё навучанне хлопчык быў вымушаны па-за яго межамі і толькі праз пэўны час вярнуўся ў родны горад, дзе ў рэшце рэшт аднавіла сваю працу брацкая школа, часова зачыненая па ініцыятыве ўніятаў. З гэтай нагоды ён пісаў наступнае: «Пачатак майго прывучэння да чытання мовай рускай быў у Шклове, а потым у Магілёве пад бакалярамі рознымі; з якіх адзначу адразу Стэфана нейкага, пасля яго Макарыя з Галоўчына, – гэта ў Шклове; у Магілёве – Цімафея Грыбача ды Паўла сталага чалавека, а пасля іх Канстанціна таксама; школа была спачатку на Максімаўскім двары (*дом аднаго з братчыка непадалёк ад Рыбнага кірмаша.* – А. С.); затым у Брацкім доме ў Астрозе пабудавана (*у 1626 г. пажар знішчыў Рыбны кірмаш з навакольнай часткай горада і брацтва ўзвяло новы школьны будынак* – А. С.)… Пасля Канстанціна быў Атанас Стрылецкі ды Фёдар Тарасовіч у той жа школе Брацкай бакаляр… Гэтыя два бакаляры ды памочнік іх часцяком, нейкі Ігнацій, чалавек сталы, вучылі мяне, адзін пачаткам латыні, а другі ўпраўляў мяне ў характар добры (*почырк.* – А.С.), да якога меў з натуры цяжкую руку». Пры гэтым, вядома, што І. Яўлевіч вучыўся ў Магілёўскай брацкай школе да 1630 г., пасля чаго ў 10-гадовым узросце з’ехаў на вучобу ў Кіеў. Адметна, што сярод настаўнікаў мясцовай

брацкай школы ён згадвае Саву Андрэевіча Магілеўчаніна, які вучыў яго лацінскай граматыцы. У 1632 г. юнак вярнуўся на Радзіму. Палічыўшы атрыманую ў Кіеве адукацыю недастатковай, ён шукаў дадатковыя магчымасці палепшыць узровень сваёй падрыхтоўцы: «Спачатку ў Буйнічах ў Сымона нейкага да пісання ўпраўляў руку, потым і ў узгаданых двух бакаляраў (*верагодна маюцца на ўвазе А. Стрылецкі ды Ф. Тарасовіч.* – А. С.) і ў фары чагосьці няшмат, у нейкага Самуэля Літвіна, які там школу трымаў (*сведчыць аб наяўнасці ў Магілёве каталіцкай школы.* – А. С.)... патроху практыкаваўся ў лацінскай мове, а адтуль перайшоў да Савы Андрэевіча (які, прыехаўшы з Кіева, вучыў латыні ў Брацтве), пасля яго ў Касовіча, студэнта з Кіева…». Не бачачы магчымасці далейшага навучання ў Беларусі, у 1636 г. І. Яўлевіч зноў адправіўся ў Кіеў, дзе сярод настаўнікаў Кіева-Магілянскага калегіўма яго зноў вучыў суайчыннік – Рафаэль Зажэцкі Магілеўчанін. Завяршыў жа сваё навучанне І. Яўлевіч засваеннем тэалогіі ды медыцыны з анатоміяй у Замойскай акадэміі [5, с. 75–78 Дадатку].

Цікава, што асветныя ўзаемакантакты Магілёва і Кіева працягваліся і ў далейшым. Сведчаннем гэтага з’уляюцца ўспаміны студэнта Кіева-Магілянскай акадэміі І. Турчыноўскага. Ва ўласнай аўтабіяграфіі ён піша, што ў час Паўночнай вайны ў 1710 г. адправіўся: «у Магілёў для вывучэння мовы лацінскай». Прыбыўшы ў горад, аднак, юнак быў вымушаны запісацца: «у школу пры царкве Святапакроўскай на Подале, дзе і перазімаваў…». Вясной 1711 г. І. Турчыноўскага залічылі ў тутэйшы езуіцкі калегіўм, але хутка выгналі, калі даведаліся аб яго праваслаўным веравызнанні. З дадзенай інфармацыі можна зрабіць некалькі высноў. Па-першае, брацкай школы ў ранейшым выглядзе пры Богаяўленскім манастыры ў горадзе ўжо не існавала, а працавала толькі пачатковая царкоўнапрыходская школа, узровень выкладання ў якой яўна не адпавядаў патрэбам кіеўскага «акадэміка». Па-другое, мясцовыя езуіты абмяжоўвалі доступу ў свой калегіўм праваслаўнай моладзі – мемуарысту было адказана ў працягу навучання, бо «ты дэ схізматык і ў схізматыкаў жывёшь». Пры гэтым, згодна ўспамінаў І. Турчыноўскага, яго выпадак быў не адзінкавым. У 1711 г. у Шклове, дзе ён жыў у Благавешчанскім манастыры (быў рэгентам царкоўнага хору і даваў прыватныя ўрокі), з’явілася яшчэ два выхадцы з Кіева, якія таксама жадалі: «у Оршы альбо Магілёве хадзіць да школ, але іх не прынялі, таму што яны набожныя (*такім чынам аўтар найменаваў праваслаўных.* – А. С.)». Разам яны на Пасху 1715 г. паставілі ў Шклове «дыялог з інтэрмедыяй», на які сабралася шмат людзей рознага веравызнання. Прысутнічалі на ім і езуіты, якія неўзабаве дабіліся выгнання ўсіх трох кіеўскіх экс-выхаванцаў з горада. Пасля чаго І. Турчыноўскі вярнуўся на Ўкраіну [6, с. 325–327].

Шмат месца ў мемуарах займала і апісанне замежных адукацыйных падарожжаў. Так, будучы канюшы ВКЛ, кн. Б. Радзівіл у 1637 г. адправіўся ў Еўропу. У першыя два гады вандроўкі ён паспеў прыняць удзел у бітве

пры Трыбзэе, агледзеў шэраг крэпасцей і праслухаў лекцыі прафесара Альтынга ва ўніверсітэце Гронінгена. Потым высакародны юнак накіраваўся ў Парыж, дзе 7 месяцаў браў прыватныя ўрокі. Апошнія князь апісваў наступным чынам: «Вучыўся ездзіць на кані ў Дэляфолі, асвойваў шпагу ў Сен-Анжэ, навучаўся танцам ў Дэ Нуаэ…» [7, с. 29–30]. Амаль уторыць яму будучы віленскі ваявода, гетман вялікі ВКЛ М. К. Радзівіл Рыбанька. У 1722 г. ён прыбыў у Парыж, дзе яго распарадак меў такі выгляд: «Гэтак гадзіны пастанавіў я: у панядзелак, аўторак, чацьвер, пятніцу ў палове шостай уставаць, а шостай ісьці на імшу да S-t Sulpice, адтуль на сёмую да манежа, там езьдзіць буду да дзевятай, а дзевятай у станцыі maitre de Mathematique да дзесятай, ад дзесятай танцмістар да адзінаццатай, ад адзінаццаці фляйтціст да дванаццатай; у сераду і суботу, паколькі не езьдзіў, фэхтмістар а манежавай хадзіў да мяне гадзіне... Па абедні час пакінуў на візыты, потым камэдыі, опэры, розныя spektacula, балі і вячэры ў паноў» [8, № 5, с. 41]. Як бачна, акцэнт на «шляхетныя» заняткі аказаўся вельмі ўстойлівым, а засваенне матэматыцы апошнім з іх – гэта хутчэй жаданне прадэманстраваць сваю прыхільнасць модным тады навацыям эпохі Асветніцтва.

Відавочна, што падобны «забаўляльна-адукацыйны» характар вандровак па Заходняй Еўропе задавольваў далёка не ўсіх з асяродддзя правячай эліты ВКЛ. Некаторыя абіралі для навучання «Рыцарскія акадэміі», дзе акрамя вайсковых прадметаў яны праходзілі і агульнаадукацыйны курс. Так, будучыя маршалак надворны ВКЛ, стараста мінскі І. Завіша і троцкі ваявода кн. Й. Т. Агінскі у 1717 г. паступілі ў падобную элітарную навучальную ўстанову ў Дрэздэне. Адпаведна «Натацыі» першага з іх заняткі тут адбываліся наступным чынам: з шостай да восьмай гадзіны раніцы юнакі вывучалі геаметрыю, механіку і вайсковую архітэктуру ў маёра Герра; з дзевятай па дзесятую гадзіну ішла лекцыя па архітэктуры грамадзянскай капітана Лефенгольца; з дзесятай да дванаццатай гадзіны кадэты практыкаваліся ў фехтаванні ў барона Герыка; пасля абеду з двух да чатырох гадзін яны займаліся простым маляваннем, а потым яшчэ дзве гадзіны ўдасканальваліся ў перспектыўным малюнку тушшу ў прыдворнага мастака Абфельштата (Апельштата) [9, с. 372–373].

Узрастанне папулярнасці замежных адукацыйных падарожжаў тлумачыцца не толькі тым, што ў дадзены час гэта было агульнапрынятай практыкай, але і састарэласцю праграм айчынных езуіцкіх школ. Сітуацыю ў іх у 1720-я гг. апісаў будучы брэсцкі кашталян М. Матушэвіч, які: «на пятым годзе жыцця ўмел чытаць і пісаць» і пасля навучання ў прыходскай школе ў Камянцы быў аддадзены пад апеку брэсцкіх езуітаў. У выніку вучобы юнак быў здольны: «цалкам без памылак увесь Альвар (*лацінская граматыка.* – А. С.) працытаваць», але нейкіх карысных для жыцця ведаў ён тут так і не атрымаў. Затое, яго мемуары насычаны згадкамі пра “нядбайных” настаўнікаў, а таксама скаргамі на занадта жорсткія пакаранні з боку адказ-

ных за дысцыпліну інспектараў – адзін тутэйшы выхаванец, не вытрымаўшы здзекаванняў, «наўмысна сабе утапіў», а двое іншых збеглі са школы. Адлюстравана ў гэтых успамінах і змяненне стаўлення грамадства да езуітаў – калі бацька М. Матушэвіча даведаўся, што яго сыну прапанавалі ўступіць у ордэн, ён тэрмінова забраў таго з калегіўма, адвёз у Гданьск, дзе накупіў «кніжак для чытання» і загадаў яму займацца самаадукацыяй [10, с. 3–5].

Знайшоў сваё адлюстраванне ў мемуарах і працэс удасканалення айчыннай адукацыйнай справы пад уплывам эпохі Асветніцтва. Сведчаннем поспехаў у гэтай справе членаў піярскага ордэну з’яўляюцца ўспаміны паэта ды філосафа І. Быкоўскага, які так апісаў свае вучнёўскія гады: «Я, наведваючы школу езуітаў у Мінску ад Інфімы аж да Рыторыкі ведаў Альвар на памяць, хаця яго і не разумеў. Як зараз мяркую, то шкада было і маёй працы, і тых пяці год, што страціў без карысці ў час той адукацыі. У 1765 г. брат мой старэйшы Раман завёз мяне ў Віцебск і змясціў у канвікце ў ксяндзоў піяраў. Там прабыў паўтары гады з куды большай карысцю, чым пяць год у Мінску ў езуітаў, тут і французскую мову троху вывучыў» [11, с. 474]. Станоўча адклікаўся аб гэтым ордэне і ўжо згаданы кн. М. К. Радзівіл Рыбанька – піяр Цэзары два гады вучыў яго розным навукам і па прызнанню самаго магната: «я, і дзісь што ўмею, дык зь інструкцыяў яго» [8, № 4, с. 23].

Першай дзяржаўнай навучальнай установай у Рэчы Паспалітай стала Варшаўская Рыцарская школа (1765). Сярод яе выхаванцаў быў ад’ютанат Т. Касцюшкі у час паўстання 1794 г. пісьменнік Ю. У. Нямцэвіч, які паступіў сюды пасля заканчэння Брэсцкага езуіцкага калегіўма. Пра сваё знаходжанне тут у 1770–1777 гг. ён успамінаў наступным чынам: «Навука і навыкі не былі першай карысцю для выхаванцаў... Былі непараўнальна даражэй правілы маральнай чысціні, павагі, любові да Айчыны, непрыманне ўсяго, што прыносіла агіду, якія нам наш правадыр кн. Адам Чартарыйскі ўліваў у сэрцы і розумы» [12, с. 32].

У цэлым, падводзячы агульную выснову прааналізаваным успамінам XVI–XVIII стст., становіцца відавочным значэнне іх аналізу для лепшага разумення спецыфікі эвалюцыі айчыннай школьнай справы ў азначаны перыяд. Так, якраз яны пацвярджаюць факт заняпаду Віленскай кальвінскай гімназіі ў канцы 1560-х – пачатку 1570-х гг., Магілёўскай брацкай школы ў сярэдзіне 1620-х гг. і канчатковага знікнення апошняй у час Паўночнай вайны. Таксама дзякуючы ім вядома аб існаванні яшчэ і ў першай палове XVI ст. альтэрнатыўнай заходнееўрапейскай педагогіцы «навукі рускай». Цікавасць маюць і неаднаразовыя згадкі асветніцкіх узаемакантактаў праваслаўнага насельніцтва Магілёва з Кіева-Магілянскім калегіўмам (акадэміяй). Утрымліваюць тагачасныя дзённікі і важную інфармацыю аб шляхах ажыццяўлення прадстаўнікамі правячай эліты ВКЛ так званага «гранд тура», калі традыцыйныя для шляхты ваенныя практыкаванні ды засваенне прыдворнага этыкету ў асобных выпадках маглі дапаўняцца

сапраўднымі школьнымі прадметамі. У сваю чаргу, аповяд сучаснікаў аб арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў XVIII ст. сведчыць не толькі аб паспяховым укараненні ў айчыннай адукацыі ідэй эпохі Асветніцтва, але і аб адпаведных зменах у светапоглядзе мясцовага грамадства. Такім чынам, не выклікае сумненняў, што мемуары хоць і суб'ектыўныя па свайму характару, але з'яўляюцца надзвычай важнымі гістарычнымі крыніцамі, вывучэнне якіх дазваляе зменшыць колькасць «белых плям» у нашай мінуўшчыне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Гусоўскі, М.* Песня пра зубра / М. Гусоўскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – 183 с.

2. *Еўлашоўскі, Ф.* Успаміны / Ф. Еўлашоўскі // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. / уклад. А. Ф. Коршунаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – С. 31–122.

3. *Турук, Ф.* Униатский митрополит Иосиф Вельямин Рутский (1613–1637) и его значение в истории униатской западной русской церкви / Ф. Турук. – Петроград: Сенатская типография, 1916. – 41 с.

4. *Vorbek-Lettow, M.* Skarbec pamięci. Pamiętnik Lekarza króla Władysława IV / M. Vorbek-Lettow; oprac. E. Galos [i inn.]. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1968. – 229 s.

5. *Голубев, С. Т.* История Киевской духовной академии. Период до-Могилянский / С. Т. Голубев. – Киев: Унив. тип., 1886. – 235 с., 121 с. Прил.

6. *Лукашевич, П. А.* Автобиография южно-русского священника 1-й половины XVIII ст. / П. А. Лукашевич // Киевская старина. – 1885. – № 2. – С. 318–332.

7. *Радзівіл, Б.* Аўтабіяграфія / Б. Радзівіл; укл. У. Сіўчыкаў. – Мінск: Радыёла-плюс, 2009. – 212 с.

8. Дыярыюш Князя Міхала Казімера Радзівіла, Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В. К. Літ. // Спадчына. – 1995. – № 4. – С. 18–47; № 5. – С. 37–57.

9. Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy, wojewody mińskiego, 1666–1721 / wydane przez J. Bartoszewicza. – Warszawa: Druk. Gazety Polskiéj, 1862. – LXXIII, 440 s.

10. Pamiętniki Marcina Matuszewicza, kasztelana brzeskiego-litewskiego: 1714–1765: w 4 t. / wydał A. Pawiński. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1876. – T. 1. – XL, 267 s.

11. *Mikulski, T.* Ze studiów nad Oświeceniem. Zagadnienia i facty / T. Mikulski. – Warszawa: Państwowy instytut wydawniczy, 1956. – 555 s.

12. *Niemcewicz, J. U.* Pamiętniki czasów moich / J. U. Niemcewicz. – Paryż: Druk. L. Martinet, 1848. – 420 s.


**(Дата падачы: 10.02.2025)**